Беларускія словы, беларускія формы, ужытыя Скарынам – іх сотні, напрыклад: *вежа, господарь, згода, жужелка, помства, праца, страва* і інш.

Увядзенне ў Святое Пісанне элементаў і форм жывой беларускай мовы мела рашаючае значэнне для лёсу рэлігійнай літаратуры ў Беларусі.

Ф. Скарына кожную з кніг суправаджаў прадмовамі і пасляслоўямі, якія складаюць аснову яго літаратурна-публіцыстычнай спадчыны. У іх першадрукар выказваў свае грамадскія і асветніцкія погляды, заклікаў да ўмацавання правапарадку, да стварэння справядлівых заканадаўчых кодэксаў аб дзяржаве, войску, змяшчаў розныя звесткі па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, філасофіі, астраноміі.

Немалаважнае значэнне ў кнігах адводзілася тэме любові да роднай зямлі. Скарына выказвае свае думкі пра патрыятычны абавязак кожнага чалавека перад сваім народам, вернасць Радзіме, пра глыбокую прывязанасць чалавека да зямлі, на якой ён нарадзіўся.

Такім чынам, Скарына даў беларускаму народу кнігу, магчымасць звяртацца да Бога на роднай мове, разумець Святое Пісанне і праз гэта адкрываць для сябе вялікі свет.

Францыск Скарына заклаў падмурак беларускай літаратурнай мовы. Яго праца – гэта праца святая. І гэта павінны памятаць мы – нашчадкі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Беларуская мова. Энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – 658 с.
2. Францыск Скарына і яго час, Энцыклапедычны аведнік. – Мінск, 1994. – 608 с.

**УДК 94 (476)**

## АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

*Студэнт – Арлоў А.А., 23 мо, 4 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт”, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць К. Тураўскага, прадстаўлена яго роля ў развіцці ўсходнеславянскай культуры.

**Ключавыя словы:** асветнік, вобраз, творчая дзейнасць, духоўнае самаўдасканаленне, рэалізацыя.

Гонарам і славай беларускай зямлі з’яўляецца найбуйнейшы майстар слова, выдатны асветнік, філосаф і прамоўца, першы епіскап Тураўскай епархіі, адзін з адукаваных людзей свайго часу Кірыла Тураўскі (каля 1130–1182). Яго свецкае імя невядома. Быў ён сынам багатых бацькоў. Адукацыю атрымаў у родным горадзе Пінску.

Імкненне глыбей спасцігнуць мудрасць Божых пісанняў прывяло юнака да прыняцця манаскага чыну. Малады манах займаўся прапаведніцтвам, павучаў манахаў і свецкіх людзей.

Каля 1144 г. Кірыла становіцца настаяцелем Нікольскага манастыра. У 1148 г. ён зачыніўся ў манастырскай вежы, куды перанёс і сваю бібліятэку, каб поўнасцю аддацца роздуму, малітвам і літаратурнай творчасці, стаўшы, такім чынам, першым вядомым на Русі стоўпнікам. Прыкладна каля 1161 г. Кіеўскі мітрапаліт узвёў Кірылу Тураўскага ў сан епіскапа горада Турава, які ён насіў больш за 13 гадоў. Гэта быў першы за сто гадоў выпадак, калі епіскапам быў прызначаны мясцовы святар, а не прадстаўнік Кіева-Пячэрскай лаўры. Памёр Кірыла Тураўскі ў апошняе дзесяціґоддзе XII ст. у чыне вялікай схімы ў Тураўскім Барысаглебскім манастыры. Магчыма, ужо ў пачатку XIII ст. ушаноўваўся як святы, хаця звестак пра яго афіцыйную кананізацыю не выяўлена.

Тураўскі епіскап праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар урачыстага царкоўнага красамоўства, які горача клапаціўся пра духоўную дасканаласць суайчыннікаў. З творчай спадчыны Кірылы Тураўскага зберагліся 3 эпічныя тэксты (“Слова на сабор 318 святых айцоў”, “Слова ў памяць усіх святых”, “Канон і сціхіры на адыход найпадобнай княгіні Вольгі, бабулі Уладзіміра”), 8 "слоў"-пропаведзяў (“Слова на Вербніцу”, “Слова на Вялікдзень”, “Слова на Ушэсце” і інш.), некалькі дыдактычных аповесцей-прытчаў (“Аповесць пра беларызца і манаства”, “Казанне пра чарнарызскі чын”), 2 каноны, каля 30 малітваў-споведзяў. У асобных творах закранаў надзённыя маральна-этычныя праблемы, важныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы. Пісьменнік імкнуўся не павучаць, а мастацкімі сродкамі раскрываць сутнасць той ці іншай рэлігійна-маральнай праблемы. У форме намаляванай словамі карціны ўзнаўляў тую ці іншую падзею новазапаветнай гісторыі.

Творы Кірылы Тураўскага ўвайшлі ў залаты фонд старажытнарускай літаратуры і на працягу стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю на землях усходніх славян, перапісваліся да XIX ст. Яны змяшчаліся ў зборніках-анталогіях "Златоуст" і "Торжественник" побач з класічнымі ўзорамі антычнай аратарскай прозы, творамі Іаана Златавуста. Асобныя працы друкаваліся ў “Евангеллі вучыцельным” (Заблудаў, 1569), “Малітвах паўсядзённых” (Вільня, 1596) і інш.

На думку даследчыкаў, мова твораў К. Тураўкага – гэта тыповая старажытная ўсходнеславянская разнавіднасць старaславянскай мовы (царкоўнаславянская). Гэта ўзор узнёслай класічнай кніжнай

царкоўнаславянскай мовы. У пазнейшых спісах яго твораў трапляюцца беларусізмы. Яго творчасць – найвышэйшае дасягненне старажытнай усходнеславянскай літаратуры ў жанры аратарскай прозы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Беларуская мова. Энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – 658 с.
2. Арлоў, У.А. Таямніцы Полацкай гісторыі. / У.А. Арлоў. – Мінск, 1994. – 462 с.

**УДК 81’38**

## СЛАВУТЫЯ ЛЮДЗІ КОПЫЛЬШЧЫНЫ: КУЗЬМА ЧОРНЫ

*Студэнт – Хартановіч Н.М., 43тс, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст.выкладчык*
*УА ”Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт”,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Кузьма Чорны** (Мікалай Раманоўскі) нарадзіўся 24 чэрвеня 1900 года ў засценку Боркі на Случчыне. Яго бацькі былі вымушаны пераехаць у вёску Цімкавічы, бо дзеці падраслі, а ў Борках не было школы.

Мікалай Раманоўскі атрымліваў адукацыю ў Цімкавіцкім народным вучылішчы, Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (навучанне там было бясплатнае а тым, хто добра вучыўся, плацілі стыпендыю).

Два гады вучыўся на педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску, але не скончыў яго. Маладому чалавеку даводзілася сумяшчаць вучобу з працай. Праз складанае матэрыяльнае становішча Мікалай Раманоўскі часам нават галадаў.

У Мікалая Раманоўскага было шмат псеўданімаў (Максім Алешнік, М. Біруля, Ігнат Булава з-пад Турава, Вясёлы, М. Сідарэўскі, Сусед-вясёлы і інш.), але ў выніку прыжыўся псеўданім, узяты ў гонар дзеда па матчынай лініі. Міхал Парыбак, таленавіты майстар-сурвэтнік, меў мянушку Чорны.

Пісьменнік-пачатковец Кузьма Чорны ўваходзіў у літаратурнае аб’яднанне «Маладняк», а калі яно перастала адпавядаць эстэтычным патрэбам творцы, стаў адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў згуртавання «Узвышша», што сведчыць пра яго творчыя пошукі і няўрымслівасць.

Многія раннія творы Кузьмы Чорнага былі мадэрнісцкімі, імпрэсіяністцкімі, заснаванымі на псіхалагізме і, на першы погляд, з невыразным, размытым сюжэтам. У большасці з іх галоўная ўстаноўка – на ўнутраныя змены персанажаў, бо асноўная задача аўтара –